9 особо охраняемых природных территорий имеют статус ключевых ботанических территорий. Это территории, отличающиеся исключительным богатством растительности, их сохранение имеет значение мирового масштаба.

На основе системы особо охраняемых природных территорий формируется национальная экологическая сеть, которая представляет собой систему природно-территориальных комплексов со специальными режимами природопользования, играющую важную роль в поддержании экологического равновесия и устойчивого развития территорий (региона, страны, континента), сохранении естественных экологических систем, биологического и ландшафтного разнообразия.

Литература


1. Стратегия по сохранению и устойчивому использованию биологического разнообразия / Постановление Совета Министров Республики Беларусь 19.11.2010, № 1707 (в редакции постановления Совета Министров Республики Беларусь 03.09.2015 № 743). – 11с.
2. Особо охраняемые природные территории Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// lidaleshoz.by/wp-content/ uploads /2017 /01/ Lida_OOPT.pdf. – Дата доступа: 01.02.2019.
3. Особо охраняемые территории [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: // www.belstat.gov.by / ofitsialnaya-statistika / makroekonomika-i-okruzhayushchaya-sreda / d-1-osobo-ohranyaemye-prirodnye-territorii. – Дата доступа: 01.02.2019.
4. ТОП-10 самых интересных природных территорий Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://greenbelarus.info/articles/22-05-2015/ top-10-samyh-interesnyh-prirodnyh-territoriy-belarusi. – Дата доступа: 01.02.2019.


## ЗМЕНА МУЗЕЙНАЙ ПАРАДЫГМЫ Ў ЗАХАВАННІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ


**Д. У. Філіпчык**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
гістарычны факультэт, вул. Чырвонаармейская, 6, 220030,
Мінск, Рэспубліка Беларусь
e-mail: fdv91@mail.ru



У артыкуле разгледжана эвалюцыя падыходу музеяў да работы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Паказана змяненне класічнай музейнай парадыгмы, у якой нематэрыяльная спадчына

разглядалася ў якасці кантэкстнай інфармацыі аб музейным прадмеце, новай музейнай парадыгмай, дзе нематэрыяльная спадчына пачала разглядацца як вартая асобнай увагі з'ява культуры. У тэксце артыкула прыведзены прыклады работы беларускіх музеяў з нематэрыяльнай спадчынай у рэчышчы новай музейнай парадыгмы.
*Ключавыя словы*: нематэрыяльная культурная спадчына, новая музейная парадыгма, беларускія музеі, захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

## MUSEUM PARADIGM CHANGE IN SAFEGUARDING OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE

**D. Philipchik**
Belarusian State University,
Faculty of History, Krasnoarmeyskaya st. 6, 220030,
Minsk, Republic of Belarus
e-mail: fdv91@mail.ru

The article covers the evolution of museum approach to work with intangible cultural heritage. It indicates the change from a classical museum paradigm that considered intangible cultural heritage as contextual information about a museum subject to a new museum paradigm, which started to perceive intangible heritage as a noteworthy cultural phenomenon. Examples of Belarusian museums' work with intangible heritage in the framework of the new museum paradigm are given in the article.
*Key words*: intangible cultural heritage, new museum paradigm, Belarusian museums, preservation of intangible cultural heritage.

Захаванне культурнай і прыроднай спадчыны ва ўмовах інтэнсіфікацыі гаспадарчага і культурнага жыцця з'яўляецца вельмі важнай задачай для беларускага грамадства. У справу захавання спадчыны ўключаюцца розныя ўстановы культуры, адукацыі, недзяржаўныя арганізацыі і зацікаўленыя супольнасці. З другога боку, само разуменне спадчыны таксама змяняецца, эвалюцыянуе. Пасля прыняцця ў 2003 г. Канвенцыі ЮНЭСКА «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» (далей Канвенцыя 2003 г.) міжнародная навуковая супольнасць усё часцей пачала звяртацца да паняцця нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей НКС). Паводле Канвенцыі 2003 г. да НКС адносяцца «звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца су-

польнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны» [1]. З увядзеннем у навуковы ўжытак паняцця НКС і ратыфікацыяй Канвенцыі 2003 г. 178 дзяржавамі (на 2018 г.) паўстала неабходнасць вызначыць месца і ролю музеяў у працэсе захавання НКС, пераасэнсаваць класічную музейную парадыгму, у якой нематэрыяльная спадчына разглядалася як кантэкстная інфармацыя аб музейным прадмеце.

Музеі па ўсім свеце, асабліва этнаграфічнага профілю, працавалі з НКС і да з'яўлення Канвенцыі 2003 г. Але нематэрыяльнай спадчынай у сучасным разуменні музеі пачынаюць займацца асабліва актыўна ў XXI ст. Адна з першых публікацый, дзе разглядаюцца тэарэтычныя і практычныя аспекты працы музеяў з НКС, з'яўляецца ў 2000 г. Гэта «ICOFOM Study Series» («Даследаванні ІКАФОМ») – міжнародны часопіс для спецыялістаў-музеёлагаў і навукоўцаў, якія даследуюць актуальныя праблемы музеялогіі. Часопіс выдаецца Міжнародным камітэтам па музеялогіі, які дзейнічае пры Міжнародным Савеце музеяў (далей ІКОМ), і тэма 32-га выпуска гучала як «Музеялогія і нематэрыяльная спадчына». Былі прадстаўлены публікацыі даследчыкаў з Аргентыны, Аўстраліі, Беніну, Бразіліі, Германіі, Кітая, Францыі, Індыі, Канады, Харватыі, а таксама кароткія справаздачы ўдзельнікаў з іншых краін. У матэрыяле даследчыка з Індыі В. Х. Бедэкар быў прадстаўлены досвед працы па стварэнні музеяў-супольнасцей, якія б галоўным чынам займаліся захаваннем і прэзентацыяй НКС, а не класічных калекцый [2, p. 18]. Артыкул кітайскага даследчыка А. Лаішун асвятляе ў музеялагічным кантэксце пытанні рэгулявання заканадаўства аб культурнай спадчыне ў Кітаі [3, p. 78]. І. Мараевіч разглядае магчымасці прэзентацыі НКС у музеі, паказвае неабходнасць успрымаць нематэрыяльную спадчыну не толькі як кантэкстную інфармацыю, але і як вартую асобнай увагі і музейнай прэзентацыі [4, p. 85]. З публікацый вынікае, што даследчыкі па-рознаму разумелі сутнасць НКС, але ў той жа час яны імкнуліся асэнсаваць магчымасці музеяў працаваць з дадзенай спадчынай.

Удзельнікі сёмай Азіяцка-Ціхаакіянскай рэгіянальнай асамблеі ІКОМа пад назвай «Музеі, нематэрыяльная спадчына і глабалізацыя» (Шанхай, 2002), прынялі так званую «Шанхайскую хартыю» адносна ролі музеяў у захаванні НКС. У тэксце дакумента была адзначана: «Важнасць творчасці, адаптыўнасці і самабытнасці народаў, месцаў і супольнасцяў, як межаў, у якіх каштоўнасці, традыцыі, мовы, вусная гісторыя, народнае жыццё і г. д. прызнаюцца і папулярызуюцца ва ўсіх

музеязнаўчых практыках і практыках спадчыны» [5]. Тэкст «Шанхайскай хартыі» заклікаў таксама разглядаць музеі як «пасрэднікі канструктыўнага партнёрства ў ахове гэтай спадчыны чалавецтва» [5].

Пасля прыняцця Канвенцыі 2003 г. у міжнароднай музейнай супольнасці актывізавалася дыскусія аб уключэнні НКС у музейную дзейнасць. Міжнародны дзень музеяў у 2004 г. прайшоў пад дэвізам «Музеі і нематэрыяльная спадчына». Пад такой жа тэмай праходзіла 20-ая Генеральная канферэнцыя ІКОМа ў Сеуле. Вынікам работы канферэнцыі з'явілася «Сеульская дэкларацыя ІКОМа аб нематэрыяльнай спадчыне», у якой усе адпаведна падрыхтаваныя музеі заклікаліся да «ўдзелу ў зборы, захаванні і папулярызацыі нематэрыяльнай спадчыны» [6].

Тэматыка НКС знайшла сваё адлюстраванне ў 4-м нумары часопіса «ICOM News» (2004 г.), дзе нават уздымалася пытанне аб пераглядзе дэфініцыі «музей» і ўключэнні ў яе азначэння нематэрыяльнай спадчыны, новых перспектывах для музеяў пасля прыняцця Канвенцыі 2003 г. і інш. [7].

Навуковы часопіс «Museum International» («Міжнародны музей») тэме НКС прысвяціў цалкам № 1–2 за 2004 г. Матэрыялы часопіса характарызаваліся глыбокім тэарэтычным асэнсаваннем праблемы, спробай удакладніць тэрміналагічны апарат, пошукам новай метадалогіі ў дакументаванні, апісанні і захаванні НКС, выпрацоўкай спосабаў узаемадзеяння музеяў з нематэрыяльнай спадчынай на навуковай аснове, вывучэннем шляхоў перадачы НКС і інш. [8, p. 108].

У выніку тэарэтычнага асэнсавання праблемы ўзаемадзеянняў музеяў з нематэрыяльнай спадчынай былі ўнесены змены ў само азначэнне паняцця «музей». У рэдакцыі 2007 г. гэта азначэнне мела наступны выгляд: «музей – гэта пастаянная некамерцыйная ўстанова, закліканая служыць грамадству і спрыяць яго развіццю, даступная шырокай публіцы, якая займаецца набыццём, захоўваннем, даследаваннем, папулярызацыяй і экспанаваннем матэрыяльнай і *нематэрыяльнай* спадчыны чалавецтва і асяроддзя яго пражывання з мэтай вывучэння, адукацыі, а таксама для задавальнення духоўных патрэбаў» [9]. Уключэнне паняцця НКС у дадзенае азначэнне пашырае сферу дзейнасці музеяў, дадаючы туды і нематэрыяльную спадчыну. Але абмежавацца простым пераносам усіх аспектаў музейнай дзейнасці з матэрыяльнай спадчыны на НКС было б не зусім правільна. Таму праблемы выпрацоўкі новай музейнай парадыгмы ў адносінах да НКС застаюцца актуальнымі і надалей, а падчас работы музеяў з НКС паўстае цэлы шэраг пытанняў.

Паводле даследавання, якое было прадстаўлена на Генеральнай канферэнцыі ІКОМа ў Шанхаі (2010 г.) Н. Крофтсам, музейныя ўстановы, што працуюць з НКС у класічнай парадыгме, сутыкаюцца з пэўнымі цяжкасцямі [10]. Нематэрыяльная спадчына імі ўспрымаецца як кантэкстная інфармацыя, карысная настолькі, наколькі яна паведамляе аб прадмеце, калекцыі і г. д. Традыцыйна музеі збіралі ўнікальныя альбо асаблівыя аб'екты, а не імкнуліся да захавання характэрнага, тыповага, як таго патрабуе Канвенцыя 2003 г. І галоўнае, што музеі (за выключэннем музеяў сучаснага мастацтва) імкнуліся захаваць, – артэфакты культур, якія ў разуменні Канвенцыі 2003 г. нельга назваць «жывымі». Музеі найперш дакументавалі звычаі, традыцыі, традыцыйныя веды, якія ўжо страцілі магчымасць перадавацца з пакалення ў пакаленне. Гэтыя сцвярджэнні, безумоўна, прымяняльныя не да ўсіх музеяў, але з падобнымі праблемамі сутыкаліся шмат якія з іх. З'яўляецца небяспека кансервацыі НКС, стварэння яго эталонных узораў, іерархій, што катэгарычна не адпавядае духу Канвенцыі 2003 г. Падобную думку выказвалі і беларускія навукоўцы. Даследчык А. А. Суша адзначае, што музеефікацыя НКС патрабуецца не заўсёды, а пры музеефікацыі элементаў НКС існуе небяспека яе кансервацыі, якая можа прывесці нават да знікнення жывой традыцыі [11, с. 35]. Таму музейныя спецыялісты павінны ўдзяляць значную ўвагу не проста фіксацыі традыцыйнай культуры, а менавіта працы з НКС у духу Канвенцыі 2003 г. і арыентуючыся на новую музейную парадыгму.

Беларускія музеі не заставаліся ў баку ад агульнасусветных тэндэнцый, імкнуліся выкарыстоўваць найноўшыя падыходы ў працы з нематэрыяльнай спадчынай. Гэта тэндэнцыя была ўласціва розным бакам музейнай дзейнасці. Так, спецыялісты *Калінкавіцкага краязнаўчага музея* арганізоўвалі музейныя экспедыцыі з мэтай вывучэння рэгіёну, дакументавання НКС. Адметна тое, што ў 1995 г. пры музеі былі створаны адмысловыя групы, што складаліся з настаўнікаў гісторыі і геаграфіі, краязнаўцаў, а таксама носьбітаў нематэрыяльнай спадчыны, якія дапамагалі ў экспедыцыйнай і пашуковай дзейнасці [12, с. 267]. Стварэнне такіх груп з уключэннем у іх носьбітаў НКС спрыяла самадакументаванню спадчыны лакальнай супольнасцю, што адпавядае апошнім сусветным тэндэнцыям у накірунку музейнага дакументавання НКС.

Музейныя ўстановы імкнуліся не толькі дакументаваць НКС, але і ўключалі яе ў экспазіцыйную прастору. Прыкладам удалага адлюстравання НКС у музейнай прасторы з'яўляецца экспазіцыя *Музея*

*традыцыйнай культуры* Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў (1997 г.). Падчас яе праектавання быў выкарыстаны тэматычны падыход, але музейныя прадметы не проста згрупавалі адпаведным чынам і прадставілі ў вітрынах, а спалучылі іх з дзеючымі майстэрнямі. Атрымалася, што носьбіты элементаў НКС упісаліся ў экспазіцыйную прастору, з'явіліся яе арганічнай часткай. Майстры дэманстравалі характэрныя для рэгіёна рамёствы: пляценне, разьбу па дрэве, ткацтва, ганчарства. Музейныя прадметы адбіраліся так, каб яны не толькі адлюстроўвалі гісторыю рамяства і саму тэхналогію, але каб паказвалі непарыўную сувязь рамяства з сучаснасцю, яго запатрабаванасць [13, л. 5]. Таму побач з прадметамі XIX – пач. XX стст. знаходзіліся таксама сучасныя вырабы мясцовых рамеснікаў. Уключэнне ў экспазіцыйную прастору дзеючых майстэрняў не толькі адпавядае духу Канвенцыі 2003 г., але і з'яўляецца спосабам прадстаўлення НКС у экспазіцыйнай прасторы без скажэння сутнасці і зместу самой нематэрыяльнай спадчыны.

У выставачных праектах таксама назіраліся прыклады ўключэння музеяў у папулярызацыю НКС. З 2010 г. супрацоўнікі *Чэрыкаўскага гісторыка-краязнаўчага музея* арганізоўвалі штогадовыя выязныя паказы прадметаў народнай творчасці і этнаграфічнай калекцыі на свяце «Бразгун», якое праводзілася ў в. Наркі. Абрад «Бразгун» і традыцыя ўшанавання абраза святых Пятра і Паўла в. Наркі Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці як элемент НКС унесены ў Інвентар НКС Беларусі [14]. Выязныя выставы, што знаёмілі з традыцыйнай культурай і НКС, арганізоўваліся музеем на свяце «Дажынкі» і на мерапрыемстве «Фестываль талентаў Магілёўшчыны» [15, л. 35].

У культурна-адукацыйнай дзейнасці музеі рэалізоўвалі праекты, якія спрыялі захаванню НКС, павышэнню асвядомленасці аб гэтай спадчыне сярод лакальных супольнасцей. Напрыклад, супрацоўнікі *Касцюковіцкага краязнаўчага музея* распрацавалі музейна-педагагічную праграму пад назвай «Вытокі». Яна складалася з трох раздзелаў, адзін з якіх («Быццё») знаёміў удзельнікаў з традыцыйнай культурай рэгіёну і НКС. Музейна-педагагічныя заняткі былі прысвечаны традыцыйнаму жыллю, адзенню, традыцыйнай кухні, рамёствам і промыслам, а таксама абрадам і звычаям рэгіёну. Адзін з заняткаў пад назвай «Традыцыі і абрады жыхароў в. Саматэвічы Касцюковіцкага раёна» знаёміў наведвальнікаў з нематэрыяльнай спадчынай асобнай вёскі, папулярызаваў НКС дадзенай супольнасці [16, с. 305].

Бачна, што ў XXI ст. сусветная музейная супольнасць імкнулася выпрацаваць новую музейную парадыгму для працы з НКС. Пасля прыняцця Канвенцыі 2003 г. праца ў дадзеным кірунку актывізавалася, а яе лагічным завяршэннем стала пашырэнне ў азначэнні ІКОМа дэфініцыі «музей» і ўключэнне туды паняцця «нематэрыяльная спадчына».

Перанос прынцыпаў, якімі музеі карысталіся ў рабоце з матэрыяльнай спадчынай, на спадчыну нематэрыяльную не прыводзіць да захавання апошняй. Таму музейныя спецыялісты імкнуцца рэалізоўваць новую музейную парадыгму ў сваёй дзейнасці, накіраванай на захаванне і прэзентацыю НКС. Яна прадугледжвае перанос увагі ў рабоце музея з калекцый і фондаў на працу з супольнасцямі, якія з'яўляюцца носьбітамі НКС. Музеі заклікаюцца да рэалізацыі прынцыпаў самадакументавання і інфармаванай згоды супольнасці ці асобных носьбітаў. У экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці музеі павінны рэалізоўваць праекты, накіраваныя на павышэнне дасведчанасці аб НКС, папулярызацыі носьбітаў пэўных элементаў нематэрыяльнай спадчыны, ствараць інтэрактыўныя выставачныя прасторы. Культурна-адукацыйную дзейнасць, звязаную з НКС, у межах новай музейнай парадыгмы неабходна накіроўваць на забеспячэнне практыкі непарыўнасці перадачы нематэрыяльнай спадчыны.

Беларускія музеі не засталіся ўбаку ад агульнасусветных тэндэнцый у сферы НКС і паказалі прыклады працы з нематэрыяльнай спадчынай у духу Канвенцыі 2003 г. у навукова-фондавай, экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці.

## Літаратура


1. Text of the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage [Electronic resource] // Official website of The United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization. – Mode of access: http://www.unesco.org/culture/ich/index.php?lg=en&pg=00006. – Date of access: 13.03.2019.
2. Bedekar, V.H. Problems of Intangible Heritage in Indian Community Museums / V.H. Bedekar // ICOFOM International Committee for Museology, Museology and the Intangible Heritage, edited by H. K. Vieregg and A. Davis. Preprints ICOFOM Study Series – ISS 32. Munich/Germany and Brno/Czech Republic. November 26 – December 5, 2000. – P. 18–21.
3. Laishun, An. Museology and Policies Concerning Heritage in China / An. Laishun // ICOFOM International Committee for Museology, Museology and the Intangible Heritage, edited by H. K. Vieregg and A. Davis. Preprints ICOFOM Study Series – ISS 32. Munich/Germany and Brno/Czech Republic. November 26 – December 5, 2000. – P. 77–79.

4. Maroevic, I. Museology and the Intangible Heritage together against the Traditional Museum or Are we Returning to the Original Museum / I. Maroevic // ICOFOM International Committee for Museology, Museology and the Intangible Heritage, edited by H. K. Vieregg and A. Davis. Preprints ICOFOM Study Series – ISS 32. Munich/Germany and Brno/Czech Republic. November 26 – December 5, 2000. – P. 84–91.
5. Shanghai Charter [Electronic resource] // Official website of ICOM. – Mode of access: http://archives.icom.museum/shanghai_charter.html. – Date of access: 13.03.2019.
6. Seoul Declaration of ICOM on the Intangible Heritage [Electronic resource] // Official website of ICOM. – Mode of access: http://icom.museum/the-governance/general-assembly/resolutions-adopted-by-icoms-general-assemblies-1946-to-date/seoul-2004/. – Date of access: 13.03.2019.
7. ICOM News 2004 [Electronic resource] // Official website of ICOM. – Mode of access: http://icom.museum/media/icom-news-magazine/icom-news-2004-no4/. – Date of access: 10.03.2019.
8. Yoshida, K. The Museum and the Intangible Cultural Heritage / K. Yoshida // Museum International. – 2004. – Vol. 221–222. – P. 108–112.
9. ICOM Statutes [Electronic resource] // Official website of ICOM. – Mode of access : http://archives.icom.museum/statutes.html#2. – Date of access : 13.03.2019.
10. Crofts, N. Grasping the intangible. How should museums document intangible heritage? / N. Crofts. – China: CIDOC, 2010. – 16 p.
11. Суша, А. Праблемы музеефікацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны / А. Суша // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў V Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 29 крас. – 1 мая 2011 г.) / рэдкал.: М. А. Мажэйка (старшыня), В. В. Калацэй, С. К. Кананові́ч. – Мінск: БДУКіМ, 2011. – С. 35–36.
12. Купрэева, Ю. С. Роля музеяў Гомельшчыны ў захаванні і папулярызацыі традыцыйна-бытавой культуры беларусаў у канцы XX – пачатку XXI ст. / Ю. С. Купрэева // Славянскі свет: мінулае і сучаснае: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., 26 сак. 2004 г., Мінск: у 3 ч. – Мінск: БДПУ ім. М. Танка, 2004. – Ч. 2. – С. 266–269.
13. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме: «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991–2016 гг. Віцебская вобласць» // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. – Фонд 9. Воп. 5. Спр. 37. А. 54.
14. Абрад «Бразгун» [Электронны рэсурс] // Сайт «Жывая спадчына Беларусі». – Рэжым доступу: http://livingheritage.by/nks/1054/. – Дата доступу: 18.02.2019.
15. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме: «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчы-

ны ў 1991–2016 гг. Магілёуская вобласць» // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. – Фонд 9. Воп. 5. Спр. 40. А. 41.
16. Тымонюк, С. С. Из опыта участия Костюковичского краеведческого музея в воспитании подрастающего поколения: музейно-педагогическая программа «Истоки» / С. С. Тымонюк // Магілёўшчына: з гісторыі краю і лёсу людзей: метадычныя парады / Установа культуры «Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел маркетынгу і бібліятэказнаўчай работы. – 2014. – №12. – С. 304–307.

## ПРИНЦИПЫ СОЗДАНИЯ КУЛЬТУРНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОСТРАНСТВА НА БАЗЕ СПЕЦИАЛЬНЫХ ДЕТСКИХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ УЧРЕЖДЕНИЙ

**О. И. Кокорева, Ю. М. Васина, О. А. Асмаловская**
Тульский государственный педагогический университет
имени Л. Н. Толстого,
факультет специальной психологии, пр. Ленина, 125, 300026,
Тула, Российская Федерация
e-mail: j_m_vasina@mail.ru

В статье рассматривается культурно-образовательное пространство детского музея, предполагающее создание условий для целостного художественно-педагогического процесса, интегрирующего познавательную, ценностно-ориентационную и творческую направленность в развитии детей. В основе культурно-образовательной деятельности детского музея определяются принципы адаптивности образовательных программ, тематический принцип, принцип цикличности и синкретизма.

*Ключевые слова*: культурно-образовательное пространство, коррекционное образование, эстетическое воспитание, дети с ограниченными возможностями здоровья.

## PRINCIPLES OF THE CREATING CULTURAL-EDUCATIONAL SPACE ON THE BASIS OF SPECIAL CHILDREN'S EDUCATIONAL INSTITUTIONS

**O. I. Kokoreva, Yu. M. Vasina, O. A. Asmalovskaya**
Tula State Pedagogical University named after L. N. Tolstoy,
Faculty of Special Psychology, Lenin ave. 125, 300026,
Tula, Russian Federation
e-mail: j_m_vasina@mail.ru